Цана асобнага нумару 20 гр. Przesyłka opłacona ryczałtem

№ 34 Вільня, Субота 30 Лістапада 1929 г. Год V (XIII).

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:	„Бел. КРЫНІЦА" каштуе на год—6 зл., на паўгода — 3 зл., на 3 месяцы — 2 зл.	Цана абвестак:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno. Ludwisarska 1-19) Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. да 4 гадз. веч.	ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.	на 1-шай староньцы 60 гр., 2 і 3 — 50 гр., на 4-ай — 40 грш. — за радок дробнага друку ў адной шпальце

Польскае каталіцтва на беларускіх землях.

(Да ідэолёгіі Б.Х.Д.)

Апошнім часам шмат пішуць аб польскім каталіцтве на беларускіх землях, а такжа і шмат для яго працуюць. Усё гэта робіцца сярод нас і быццам для нас.

Сярод беларусаў - каталікоў вядзецца ажыўлевая польская каталіцкая праца праз касьцёл лацінскі, а сярод беларусаў праваслаўных вядзецца так-жа польская каталіцкая праца праз усходні касьцёл ці лепш праз унію.

Уся гэтая польская праца для нас беларусаў мае прынцыповае значэньне і дзеля гэтага мы, асабліва беларусы-праваслаўныя, маўчком яе абходзіць ня можам.

Каталіцтва, разгляданае тэорэтычна, гэта ёсьць хрысьціянская рэлігія, якая, маючы на мэце выключна ідэалы духовыя, зьяўляецца вышэйшай справядлівасьцяй; яна, пашыраючыся сярод розных народаў, для лягчэйшага правядзеньня сваіх ідэалаў, звычайна карыстаецца мовай гэтых народаў і гэтым зьяўляецца будаўнічым культуры кожнага народу.

Гэтак ёсьць у тэорыі і, агулам бяручы, гэтак ёсьць больш-менш у рожных краёх у практыцы, але ў нас, на землях беларускіх, каталіцтва цалком інакш выглядае.

Каталіцтва на Беларусь прыйшло даўней і ідзе цяпер праз Польшч. Польшч-жа настолькі нацыяналістычная, настолькі пазбаўлена хрысьціянскага і каталіцкага духу ў гэтай місіі, што, нясучы каталіцтва на Беларусь, руйнуе наш народ, яго культуру, яго самабытнасьць.

Каталікоў беларусаў лацінікаў, якіх пад Польшчай знаходзіцца больш-менш мільён, не гаворачы аб Латвіі і Б.С.Р.Р., польскі каталіцкі касьцёл уважае за сваю прыватную ўласнасьць. Адносіны польскага каталіцтва да беларусаў-каталікоў не каталіцкія, а чыста палітычныя.

Беларуская мова ў касьцельным жыцьці фармальна праследуецца. Віленскі польскі арцыбіскуп Ялбжыкоўскі, ня глядзячы на ўсільныя просьбы прыхаджан, выгнаў беларускую мову з касьцёлаў у Жодзішках і Барадзенічах. Выгнаў ён так-жа беларускую мову ў Трычоўцы, Беластоцкага павету і, як даведываемся, робіць стараньні, каб выгнаць беларускую мову з касьцёла ў Друі, Браслаўскага пав.

Арцыбіскуп Ялбжыкоўскі найвыразьней крыўдзе беларускае-каталіцкае духавенства, пазбаўляючы яго прыходу за ўжываньне беларускай мовы ў касьцеле (Кс. В. Шутовіч, які, ўцякаючы ад праследу, апынуўся аж у Амэрыцы), назначаючы ксяндзоў беларусаў на польскія парафіі (Кс. Я. Семашкевіч) і не баронячы ксяндзоў беларусаў прад крайна-рашучым абходжаньнем з імі ўраду (Кс. Др. Я. Рэшэць).

Арцыбіскуп Ялбжыкоўскі год таму, як ведаем, забараніў беларусам-каталіком чытаць „Б. Крыніцу" (хоць гэтай забароны бадай ніхто ня споўніў), толькі за тое, што яна адкрыта і сьмела змагалася з „польскай верай", з польскім нацыяналізмам польскага каталіцтва на Беларусі.

Адносіны да беларусаў-каталікоў польскага біскупа Лазінскага такія-ж самыя. Як даведываемся, у яго епархіі беларусы-каталікі ня раз ужо дамагаліся сваей мовы ў касьцеле. Ведаем, што астатнім часам беларусы-каталікі з прыходаў: Новая-Мыш, Мядзьведзічы, Ляхавічы прасілі біскупа Лазінскага дазволіць ужываць ім беларускай мовы ў сьвятынях, а на што аднак дазволу да гэтуль не атрымалі.

І гэты біскуп так-жа праследуе ксяндзоў беларусаў, выганяючы іх у не беларускія прыходы (кс. П. Татарыновіч).

Як віленскі арцыбіскуп Ялбжыкоўскі, так і пінскі біскуп Лазінскі на супроць звычайнай прыроднай справядлівасьці, ня ўводзячы дагэтуль у свае сэмінарыі беларускай мовы, і далей уважаюць іх за звычайныя кузьні полёнізму. Для іх важней усяго польскі нацыяналізм.

Але мала гэтага. Гляньма на ўнію, якую тыя-ж палякі прабуюць правадзіць на нашых землях. У тэорыі ўнія—гэта так-жа каталіцызм, толькі ў усходнім абрадзе. У практыцы-ж гэта той-жа польскі палітычны каталіцызм.

Падзел хрысьціянства на Заходняе і Усходняе ў XI сталецьці абняў паволі і Беларусь, якая ў большасьці сваей аказалася ўсходня-праваслаўнай. Пробы злучэньня нанова хрысьціянства адбываліся колькі разоў, але еднасьць між каталіцкім захадам і праваслаўным усходам усьцяж рвалася. Найтрывалейшай спробай аб'яднаньня каталіцтва і праваслаўя была ўнія Берасьцейская ў 1596 г. Унія гэта на Беларусі фармальна трывала 240 гадоў, з якой народ наш, агулам кажучы, зжыўся і адчасьці ўважаў яе за сваю кроўную. Хоць з другога боку на Беларусі за гэты час ніколі не пераставала існаваць также і праваслаўе, ня спыняючы часта ўпорыстага змаганьня з уніяй. З уніяй, наколькі яна ставалася апорай беларускай нацыянальнасьці, польскае лацінскае духавенства не магло прымірыцца. Яно так дрэнна трактавала ўнію, як веру ня польскую, такія для яе стварала цяжкія варункі, што тая паволі была прымушана лацінізавацца і полёнізавацца, каб мець роўныя правы ў Польшчы з польскім каталіцтвам лацінскага абраду. І свайго дапялі. Ужо ў XVIII сталецьці ўнія, прадусім у асобе ўніяцкага вышэйшага духавенства і ў асобе манашаскага ордэну Васыльянаў, ужо была звычайным польскім каталіцтвам. Гэтакая палітыка польскага каталіцызму на нашых землях на пачатку XIX сталецьця стварыла Семашку, які, відзячы, як ашуканай сталася яго ўніяцкая царква, перадаў усю ўнію ў праваслаўе, дзе бачыў у чыстай форме веру прадзедаў сваіх.

Гэта зьявішча польскае каталіцтва разважала тады і разважае цяпер пераважна, як здраду польскасьці, бо аб каталіцтве гавора мала, а калі й гавора, дык ідэнтыфікуе яго з польскасьцяй. Нават езуіцкі кракаўскі „Przegląd Powszechny" у гэтых справах займае дужа двузначнае становішча.

У ўскрэшшай Польшчы, ведама, ускрэсла і ідэя ўніі, ускрэсла з тымі-ж тэндэнцыямі, што і даўней, як памост да лацінізацыі і полёнізацыі беларусаў. І, здаецца, мы ня мылемся. На дзьве лацінскія епархіі віленскую і пінскую, на тэрыторыі якіх зьяўляюцца зародкі уніі, як ведаем, адзін толькі духоўнік гавора пабеларуску казаньні, а іншыя-ж, якіх ёсьць пару дзесяткаў, цяпер гавораць парасейску, каб з часам перайсьці на мову польскую. Гэрархічна гэта ўнія так-жа цалком залежна ад духавенства польскага. Ці-ж гэта каталіцтва? Ці-ж гэта хрысьціянства? Не! Гэта польская палітыка.

Апошнім часам польскія біскупы на беларуска-украінска-літоўскіх землях зьвярнуліся да суду аб передачу аж да 500 праваслаўных цэркваў каталіком на тэй толькі падставе, што цэрквы гэтыя былі некалі ўніяцкія. Але ці-ж гэтага вымагае вышэйшая справядлівасьць? Ці-ж гэтага вымагае любоў Хрыста? Не, гэтага вымагае толькі інтэрэс польскасьці. Гэныя сьвятыні, прад тым, як стацца ўніяцкімі, бадай у большасьці выпадкаў, былі праваслаўныя. Унія-ж даўней праводзілася не канечна толькі дабравольна, гісторыя многа натуе ў гэтым і звычайных гвалтаў. Такім чынам, праваслаўныя сьвятыні, збудаваныя коштам і мазалём нашых праваслаўных прадзедаў, пад прыкрыцьцем хрысьціянства, маюць перайсьці ў валадарства польскасьці.

Ведамы ўніят, па нацыянальнасьці расеец, а. Діодор Колпінскі, нядаўна пакінуўшы Польшч, з дарогі ў далёкі Харбін, разважаючы ўсю трагічнасьць польскага каталіцтва на нашых землях, пісаў да ведамага расейскага пісьменьніка ў Варшаве Філософова, які пісьмо яго быў зьмясьціўшы ў расейскай газэце „За Свободу!": што в Польше не католицизм, но... (далейшых слоў, дзеля прычын цэнзуральных, надрукаваць ня можна).

Пры гэтым так-жа трэба адзначыць, што польская палітычная праца на беларускіх землях вядзецца ня толькі праз поль-

скае каталіцтва лацінскага і ўсходняга абраду, але так-жа і праз праваслаўе, якое польская палітыка прыбірае, як кажуць, да рук і паволі, але сыстэматычна таж-жа робіць з яго аружжа полёнізацыі праваслаўнага беларускага насяленьня.

Дык што рабіць, як аднесьціся да наступу польскага нацыяналізму ў плашчы каталіцтва? Дзе выхад з грознай для народу небясьпекі? Вось-жа адказ на гэтыя пытаньні просты. Мы ня можам аддацца ў палон цалком „польскай веры". *Першым-жа этапам барацьбы в наступам на нас польскасьці пад прыкрыцьцем хрысьціянства — гэта будзе: паглыбленьне беларускай народнай сьведамасьці сярод шырокіх беларускіх мас, як праваслаўных, так і каталікоў, пашыраючы сярод іх пачуцьцё брацкай еднасьці і любові, лучэньне іх у адну супольную, дружную, моцную беларускую нацыянальную арганізацыю.*

Праваслаўны беларус.

400-лецьце Літоўскага Статуту.

(30.XI.1529—30.XI.1929).

Ужо ў XIII ст. Беларусь злучылася з Літвой і ўвайшла ў склад Літоўскай дзяржавы. Супольнае літоўска-беларускае аб'яднаньне трывала аж да другой паловы XVI ст., да Люблінскай Уніі 1569 г. Час гэты станавіў сапраўды сьветлую пару ў гісторыі гэтых абодвых народаў. Літоўцы і Беларусы стварылі адну супольную дзяржаву больш паразуменьнем і ўзаемным інтарэсам, як вайной. У супольнай літоўска-беларускай дзяржаве панавала поўная свабода веры і культуры. Беларусы, прыняўшы хрысьціянства ў X ст. з усходня-хрысьціянскай Візанцыі, паволі прымалі ад яе так-жа навуку, цывілізацыю і культуру. Літвіны-ж да 1386 г. былі паганамі і культурна стаялі ад Беларусаў шмат ніжэй. Аднак Беларусы не накідалі ім ані сваей веры, ані культуры, ані мовы. Літвіны ўсё гэта прымалі самі дабравольна. У канцы XIV ст. больш як 50 літоўскіх розных князёў ужо трымаліся ўсходня-хрысьціянскай веры, а мова беларуская праз увесь час існаваньня літоўска-беларускай дзяржавы была мовай урадавай, дзяржаўнай. У гэтай мове судзілі, кіравалі дзяржавай, гаварылі: народ, магнаты, а нават князі. Так напр. вялікі князь літоўскі Ягайла, як кажуць гісторыкі, гаварыў выключна пабеларуску.

У 1386 г. адбыўся хрэст Літвы і, дзеля ўнутраных небясьпекаў, наступіла першая ўнія з Польшчай. Паводле ўмовы кароль польскі мусіў быць адначасна і вялікім князем літоўскім, а Польшча і Літва з Беларусяй мела станавіць адну суцэльную дзяржаву. Але жыцьцё дыктавала што іншае. Літоўска-беларускі край меў перавэжна сваіх асобных вялікіх князёў і кіраваўся сам сабой, сваім сэймам у Вільні, сваімі законамі. Літоўска-беларускае аб'яднаньне і фактычная незалежнасьць краю трывала аж да Люблінскай Уніі.

Ад часоў Вялікага Князя Вітаўта ўстанавіўся звычай, што вялікі князь, прымаючы кіраўніцтва краем, прыракаў захаваць правы яго даўнейшыя, а так-жа часта надаваў новыя. Вось гэтымі правамі і кіравалася Вялікае Князьства Літоўска-Беларускае.

Але гэткага роду права было ня поўнае і мала даступнае для практычнага карыстаньня.

Вось-жа стараньнем літоўска-беларускай шляхты быў апрацаваны кодэкс права Статут Літоўскі, прыняты на Віленскім Сойме 17(30) лістапада 1529 г., пазьней названы першым, або старым.

Назова гэтага Статуту: літоўскі— палітычная. Усе беларуска-літоўскія землі зваліся Вялікім Князьствам Літоўскім, бо Вялікія Князі, як прадстаўнікі найвышэйшай улады, былі Літоўцы. Дзеля гэтага і законы нашага краю зваліся літоўскімі.

Першым Статутам да выданьня другога новага ў 1566 г. кіраваўся край наш на працягу 37 гадоў. Праз увесь гэты час існаваў ён у рукапісі напісанай па беларуску. Друкаваны ня быў ніколі. У рукапісі дайшоў ён аж да пач. XIX ст. і ў 1841 г. быў надрукаваны ў Пазнані ў „Zbiory praw Litewskich", а ў 1854 г быў надрукаваны ў „Временник'у" Маскоўскага „Общества истории і древностей".

І так 30 лістапада сёл. г. мінае 400 гадоў ад часу, калі першы Літоўскі Статут быў прыняты нашым Соймам у сталіцы літоўска-беларускай дзяржавы ў Вільні.

Гэтыя так рэдкія ўгодкі — гэта вялікае беларускае культурнае сьвята.

Статут гэты, як на той час, быў дужа высокім культурным здабыткам нашага краю; такіх законаў могбы пазавідваць тады не адзін народ у Эўропе. Падобных законаў ня было так-жа і ў Польшчы.

Першы Літоўскі Статут, праўда, меў на воку прадусім інтарэсы шляхты, якая ў той час была пануючай клясай, але апрача гэтага браў ён такжа пад увагу і інтарэсы ўсей дзяржавы і ўсіх жыхароў яе. Найцікавейшым ў гэтым Статуце для нас будзе тое, што ў ім Вялікі Князь Літоўскі прыракае сьцерагчы граніц дзяржавы і павялічваць іх, а так-жа, што Статут гэты палякоў уважаў за чужынцаў, дзеля гэтага не дазваляў ім займаць у Літоўска-Беларускай дзяржаве ўрадавых пасад, а так-жа набываць зямлі. З гэтых артыкулаў Статуту бачым самастойнасьць Вялікага Князьства Літоўскага і імкненьне да яе абароны. Першы Літоўскі Статут, як кодэкс праўны, гэта — прадукт двух народаў: Літоўскага і Беларускага, але як кніга пісаная ў беларускай мове — гэта здабытак беларускай культуры з залатой пары яе.

Першы Літоўскі Статут лёг у аснову другога (1566), а пасьля і трэцяга (1588), які далей абавязываў на літоўска-беларускіх землях, як пасьля Люблінскай Уніі 1569 г. так-жа і пасьля падзелу Польшчы, калі мы былі пад Расеяй, аж да 1840 г.

Словам, 400-лецьце першага Літоўскага Статуту — гэта вялікае беларускае культурнае сьвята. Яно вымоўна нам гавора, на што здольны беларускі народ. Яно вуча нас так-жа, што ўскрэшана ў памяці народу слаўная мінуўшчына — залог яго будучыні.

А. Сакалінскі.

Бацькі беларускіх дзетак! Ці вы не забыліся, што школьныя дэклярацыі палаюцца толькі да Новага Году? Не прапусьцеце-ж тэрміну, каб вашы дзеткі на вас не крыўдавалі.

З газэт.

Так-жа пазналіся.

Літоўская віленская газэта „Wilniaus Rytojus" з 22 г. м. пад загалоўкам „Беларуская санатарская акадэмія", падчорківаючы крыўднае для літоўцаў цьверджаньне прэлегента студ. Ст. Станкевіча на акадэміі ў чэсьць Івана Луцкевіча, што быццам немцы стварылі ў сваім часе ў Вільні літоўскую Тарыбу (Тымчасовы Урад Літвы), —заяўляе: „што так гаворяць беларуская санатары, мы ня дзівімся. Кожны нармальны чалавек ведае, што Літва паўстала не дзякуючы ласцы Немцаў, але дзякуючы сваей народнай сіле і ахвярнасьці. Верым, канчае „Wilniaus Rytojus", — што і народ беларускі ня йнакш думае".

Пэўне-ж, народ беларускі ведае, што Літва здабыла незалежнасьць, дзякуючы сваей уласнай ахвярнасьці і вытрывалай народнай працы; ведае ён так-жа, што беларуская санацыя на чале з Антонам Луцкевічам і Янкам Станкевічам на тое і існуе, каб уводзіць дэзарганізацыю ў беларускую адраджэнскую народную працу, а так-жа псуць добрасуседзкія адносіны між народам літоўскім і беларускім. У.

Украінскія дэманстрацыі ў Львове.

Газэты падаюць, што украінская моладзь у мінулым тыдні выступіла дэманстрацыйна з рашучым пратэстам проціў бальшавіцкага тэрору ў Радавай Украіне і проціў москвофілаў. Дэманстранты выбілі вокны ў бальшавіцкім консуляце ў Львове, а так-жа і ў памешканьні „Сель.-Робу" дзе сарвалі шыльд арганізацыі. Здэмалявалі рэдакцыю „Зямлі і Волі" і „Русского Голосу".

У часе гэтых дэманстрацыяў інтэрвэнявала паліцыя, якая арыштавала больш дзесятка асоб. Тыя-ж газэты падаюць, што ў дэманстрантаў бальшавіцкі консул два разы выстраліў, але ні кога не забіў і ня раніў.

Пры гэтым трэба сказаць, што расейскія камуністы ў Радавай Украіне ня лепш абходзяцца з украінцамі, як у Радавай Беларусі з беларусамі.

З Беларускага жыцьця.

ПАД ПОЛЬШЧАЙ

Цэнтральны Урад Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры аб музыкальным інструманце на Беларусі—дудзе. Як ведама, музыкальны інструмант — дуда, у цяперашні час ужо рэдка дзе можна спаткаць сярод беларуская насельніцтва і гэты інструмант адыходзіць у забытак, астаючыся толькі ў музэі. А дзеля таго, што дуда ад непамятных часоў здабыла сабе правы называцца беларускім нацыянальным музыкальным інструмантам, Ц. У. Бел. Інст. Гасп. і Культуры пастанавіў пачыніць стараньні дзеля ўтрыманьня гэтага інструманту ў народзе праз распаўсюджываньне яго.

Даведаўшыся аб існаваньні яшчэ жывой дуды ў Браслаўскім павеце г. зн., што ёсьць такі чалавек, каторы на гэтым інструманце йграе і ўмее яго зрабіць Ц. У. Б. І. Г. і К. пастанавіў зьвярнуцца да гэтага мастака з просьбай зрабіць на кошт Інстытуту дуду і навучыць там каго ахвотнага йграць на гэтым інструманце.

Характэрнае зьявішча, што гэны чалавек сваей ужо старой дуды ні за якую цану прадаць ня хоча.

Канфіската „Шляху Моладзі". Дня 26 г. м. прэсавы аддзел віленскага Гарадзкога Староства загадаў канфіскаваць № 8 „Шляху Моладзі" за стацьцю „Крыху аб сучаснасьці" — Я. Н. і верш „Падымайся народ!" — Ул. Казлоўшчыка. Улады загледзілі ў стацьці „Крыху аб сучаснасьці" праступак кваліфікаваны распараджэньнем Прэзыдэнта з дня 10.V.1927 г. аб праве прасовым і 129 арт. К. К. Рэдактар гэтай часопісі, студэнт гуманістыкі У. С. Б. — Мар'ян Пецюкевіч будзе адказываць прад Судом за гэта паводле 129 арт. К. К. і расп. Прэзыдэнта з дня 10.V.1927 г. аб праве прэсавым.

Часопісь „Ш. М." мае характар апалітычны.

„Шлях Моладзі" пасьля канфіскаты. Дня 28 г. м. выйшаў № 9 „Ш. М." у новым накладзе. Зьмест даволі багаты і цікавы.

Культурная праца на вёсцы. У апошні час, як нас паведамляюць у в. Сычанятах, Вялейскага павету і ў в. Селец, Лідзкага пав. былі зладжаны беларускія прадстаўленьні, пасьля якіх выступалі тамашнія хоры, якія прапялі беларускія народныя песьні.

Ці тут не палітыка санацыі? У гэтым 1929 г. прыпадае юбілей 400 лецьця Літоўскага статуту. Дзеля таго, што Літоўскі Статут з 1529 г., які выданы ў беларускай мове і сваім зьместам абыймае з боку юрыдычнага ўсе праўныя звычаі нашага народу і праз гэта зьяўляецца вялікім памятнікам слаўнай прошласьці Беларускага народу — беларускае грамадзянства гэны юбілей належна абходзіць. Беларускі Студэнскі Саюз у сваей часопісі „Студэнская Думка" пасьвячае даволі рэчовую стацьцю гэтаму юбілею і такім спосабам абходзіць гэты юбілей з шырэйшымі кругамі беларускага грамадзянства. Гэтак сама абходзіць гэты юбілей і беларуская моладзь, якая групуецца каля часопісі „Шлях Моладзі" пасьвячаючы ў сваей часопісі адпаведную стацьцю аб Літоўскім Статуце. Гэтак абходзім гэты юбілей, 400 лецьця Літоўскага Статуту, разам з шырокімі беларускімі масамі і мы, пасьвячаючы ў гэтым нумары „Б. К." адпаведную стацьцю аб Літоўскім Статуце. Абходзіць гэты юбілей і беларуская полёнофільская санацыя на чале з Антонам Луцкевічам і Янкам Станкевічам. Санацыя гэты юбілей абходзіць больш шумна, бо зарганізавала спэцыяльны камітэт дзеля абходу гэтага юбілею, у які ўваходзяць Антон Луцкевіч і Янка Станкевіч. Гэтую ўрачыстасьць беларускія санатары-полёнофілы ладзяць так, каб належна адсьвяткаваць юбілей і сябе паказаць беларускімі дзеячамі. Падыход даволі хітры.

Але на гэтым луцкевічаўска-спадароўскім палітычным манэўры ўжо беларускае грамадзянства пазналася. Каб ня быць галаслоўнымі, падаём тут пастанову Цэнтр. Ураду Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры з дня 3 лістапада с. г., які на запросіны луцкевічаўска-спадароўскай кампаніі, прыняць удзел у нарадах камітэту дзеля сьвяткаваньня юбілею 400 лецьця Літоўскага Статуту пастанавіў адказаць так:—„Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры спагадае ўсім культурным пачынаньням беларускіх установаў, аднак-жа прыняць удзелу ў нарадах камітэту дзеля сьвяткаваньня 400 угодкаў выданьня Літоўскага Статуту ня можа, бо відзіць там ня столькі тэндэнцыі культурныя, сколькі палітычныя."

З РАДАВАЙ БЕЛАРУСІ.

Крыху аб беларусізацыі. Як маскоўскія камуністы праводзяць беларусізацыю ў Радавай Беларусі, мы ўжо ня раз пісалі. Паслухайма, што пішуць самі бальшавікі аб гэтай беларусізацыі.

Менская „Зьвязда" у нумары 249 з 20.Х. с. г. у заметцы пад загалоўкам „Аб беларусізацыі" даслоўна піша так. —

„Хаця сэкратар ячэйкі т. Олікер у сваёй справаздачы і сказаў, што беларусізацыя на мэдфаку (мэдыцынскі факультэт-рэд.) пастаўлена здавальняюча, але-ж, як відаць, гэта ня зусім так. Сам сэкратар рабіў справаздачу на расейскай мове, вялікая колькасьць як партыйцаў, так і беспартыйнага студэнцтва, а таксама навуковых працаўнікі выказваліся на расейскай мове. Выступаючыя таварышы адзначалі, што белмова (беларуская мова-рэд.) ня ўжываецца партыйцамі ў штодзенным жыцьці, што частка партыйцаў ужывае белмову толькі на ўрачыстых паседжаньнях".

З гэтага відаць, што ў радох компартыі ў Радавай Беларусі беларускага амаль ня ма, а ў большасьці гэтая „партыя" становіць элемэнт наплывовы з Расеі, які на Беларусі ўважаецца за праўных гаспадароў, а беларусаў за „нацыянал-дэмократызм" выганяюць з пасадаў ды высылаюць у глыб Расеі. Сусім так, як і цар рабіў.

Зьвязда" № 250 з 31. Х. с. г.) падае, што Тэрміналёгічная камісія пры навуковым мэдычным савеце НКАЗ занялася распрацоўкаю беларускай клінічнай тэрміналёгіі і беларускай тэрміналёгіі ў аптэчнай справе. Згодна прынятаму пляну, кожная клініка і адпаведная катэдра павінны скласьці тэрміналёгію паводле вузкай сваёй спэцыяльнасьці. Апрацаваныя такім парадкам праекты паступаюць на папярэдні прагляд у тэрміналёгічную камісію і потым накіроўваюцца ў інстытут навуковае мовы БАН.

Прымаючы пад увагу, што Народны Камісaрыят Аховы Здароўя і БДВ прызналі мэтазгодным выданьне практычнага мэдычнага слоўніка, выраш**а**на скончыць яго апрацоўку не пазьней вясны надыходзячага году. Слоўнік будзе зьмяшчаць у сабе каля 10 тысяч слоў.

Новыя беларускія навуковыя інстытуцыі. Пры беларускай Акадэміі Навук арганізуюцца новыя навуковыя інстытуцыі — гістарычных навук і мовазнаўства. Інстытут гістарычных навук будзе складацца з Камісіі па Гісторыі Беларусі, сусьветнай гісторыі, у сувязі з гісторыяй Беларусі археографічнай, археолёгічнай і гісторыі беларускага мастацтва.

Інстытут мовазнаўства абʼядна̄е ўсе ўстановы аддзелу гуманітарных навук, якія займаюцца вывучэньнем беларускай мовы. Дырэкцыя інстытуту мовазнаўства выключана ў складзе акадэмікаў, Некрашэвіча, Лёсіка і сэкратара праф. Бузука.

Аб вышэйшым падае „Зьвязда з дн. 12-XI-29,

З Незалежнай Літвы.

Д-р Заунюс — міністрам заграгічных спраў. У новым урадзе Літвы, дэкрэтам прэзыдэнта рэспублікі, міністрам заграгічных спраў Літвы, назначаны д-р Заунюс.

Зімовыя курсы для рольнікаў. Міністэрства земляробства ад 1 г. м. у ва ўсей Літве зарганізавала вялікую лічбу спэцыяльных курсаў для рольнікаў. На гэтыя курсы літоўскі ўрад высыгнаваў 10 тысяч літаў, пераважна для тых ваколіц, у якіх не адбыліся такія-ж курсы ў мінулым годзе.

Пашырэньне асьветы і культуры сярод жанчын. Адпаведныя літоўскія дзяржаўныя улады арганізуюць для жанчын навуковыя курсы, як: 1. варыць ежу, 2. утрымаць парадак у хаце і агулам у гаспадарцы. Выдаюцца так-жа адпаведныя брашуркі, у якіх павучаецца: як гадаваць дзеці, аб гігіене жаночай і г. д.

З Украінскага жыцьця.

Пратэсты ўкраінскай моладзі проціў чырвонага тэрору у Радавай Украіне. Дня 14 і 18 г. м. украінская моладзь вынесла пратэсты проціў тэрору маскоўскіх камуністаў у Радавай Украіне вось такога зьместу:

1) „Слухачы Вышэйшай Коопэратыўнай Школы ў Львове рашуча пратэстуюць проціў чырвонага тэрору маскоўскіх шавіністаў і іх прыслужнікаў у Радавай Украіне, якія яны прымяняюць супроць украінскіх дзеячоў і шырокіх сфэраў украінскага сьведамага грамадзянства і безгранічна верадь, што недалёкі той час, калі ўкраінскі народ помсьціцца над маскоўскімі акупантамі Украіны за ўсе тыя ахвяры і крыўды, якія яму прычынілі яго ворагі."

2) „Слухачы аднагадовага курсу для абітурʼентаў у Львове пратестуюць проціў чырвонага шалу маскоўска-жыдоўскіх камуністаў і іх засьлепляных прыхільнікаў у Радавай Украіне. Крывавыя чрэзвычайкі за дванаццаць гадоў свайго деспотычнага панаваньня зьнішчылі дзесяткі тысяч сьведамага ўкраінскага грамадзянства. І ў гэты час у скляпох чрэзвычайкі, ў турмах, на Салавецкіх вастравох у Сібіры тысячы Украінцаў чакае сьмерці з рук чырвоных катаў, якія сьмяротныя прысуды выконваюць не пасьля даказанай віны, а пасьля свайго бальшавіцкага сумленьня. Украінскі народ не адчуваў такога тэрору нават за панаваньня маскоўскіх цароў. Каліcь царскі бюркратычны ўрад на касьцях нашых прадзедаў збудаваў сваю сталіцу, а сяньня работніцка-сялянскі ўрад крывёй закрапляе маскоўскі Крэмль, каб не дапусьціць да развалу турмы народаў. Але мерка цярпеньня ўкраінскага народу хутка перапоўніцца і Ён паложыць канец панаваньня маскоўскіх акупантаў на яго землях."

З Польшчы.

Крыху аб унутранай палітыцы. Пісаць аб унутранай палітыцы Польшчы цяпер не бязпечна, бо няма ведама ў якім кірунку яна пойдзе. Адно толькі сказаць можна, што заявіў прэмʼер Світальскі на многалюдным сабраньні ў Варшаве. Ён сказаў: што — урад марш. Пілсудзкага стаіць на тым становішчы, што польская конституцыя мусіць быць зьменена. Але не сказаў, як будзе зьменена і ў які спосаб, адно толькі падчоркнуў, што „няспынімся ў змаганьнях да сваей мэты і гэтую барацьбу выйграем".

З гэтага відаць, што ўрад Світальскага з свайго палітычнага становішча, ідэолёгам якога ёсьць марш. Пілсудзкі, зыйсьці ня думае.

Студэнскія дэманстрацыі ў Варшаве. У мінулым тыдні адбыліся ў Варшаве студэнскія дэманстрацыі. Студэнты дэманстравалі быццам проціў нямецка-польскага ліквідацыйнага дагавору. Газэты-ж, якія стаяць блізка ўрадавых кругоў, пішуць, што гэтыя дэманстрацыі былі фактычна проціў ураду. Эндэкі вышлі на вуліцу.

Камуністычная дэманстрацыя ў Варшаве. Дня 20 г. м. варшаўскія камуністы з прычыны 11 угодкаў паўстаньня міжнароднай арганізацыі кам. моладзі, наладзілі дэманстрацыі. Паліцыя дэманстрантаў разагнала. У часе разбяганьня чутны былі стрэлы. 1 асоба забіта і 3 ранены. Высьвнілася, што забіты ёсьць сябра П.П.С. рэв. фракцыі (казённых сацыялістаў). Многа асоб арыштавана.

З Заграніцы.

У Мэксыку ў прошлым тыдні адбыліся выбары прэзыдэнта. Выбары гэтыя адбыліся вельмі бурліва. У сталіцы Мэксыка дайшло да крывавых сутычак. Прыхільнікі кандыдата на прэзыдэнта Ортіза Рубё напалі на агітацыйнае памешчаньне прыхільнікаў другога кандыдата. Між гэтымі двама кірункамі паўстала заўзятая бойка, у якой забіта 6 асоб. На правінцы, прыхільнікі Рубё так-жа нападалі на выбаршчыкаў, якія йшлі проціў Рубё. Агульная лічба ахвяр, прэзыдэнтскіх выбараў налічваецца 20 асоб забітых і 200 раненых.

На прэзыдэнта выбраны Паскаля Ортіз Рубё, які належыць да тае партыі, да якой належалі прэзыдэнты Мэксыка Калес і Обрэгон.

Францыя, як і іншыя дзяржавы, гаворачы аб разбраеньні ўсіх, зброіцца. Французскі міністр збройнай сілы на моры падаў у парлямант праект будовы новых ваенных караблёў. Кошт гэных караблёў будзе выносіць 1.268.228.000 франкаў. Гэта сума мае быць устаўлена ў будэжты ад 1930 да 1934 г.

Міжнародны Рэпэрацыйны Банк. Францыя, Англія, Нямеччына, Амэрыка, Японія, Італія і Бэльгія залажылі банк, які мае аснаўны капітал 500 мільёнаў швайцарскіх франкаў... Больш, як палавіну складак уплачваюць у гэты банк вышэй пералічаныя дзяржавы, а рэшта могуць уплачваць і іншыя дзяржавы. Галоўныя заданьні гэтага банку — прыймаць нямецкія рэпэрацыйныя сплаты і раздзяляць іх тым дзяржавам, якім Нямеччына змушана плаціць за прайграную вайну.

Як відаць, гэты банк знаходзіцца ў руках антантскіх дзяржаваў з сяброўствам Нямеччыны і Амэрыкі і толькі яны будуць ім карыстацца.

У С.С.Р.Р. цяпер праводзяць камуністы „чыстку" компартыі. У выніку гэтай „чысткі" у Радавай Украіне ўжо выключана з компартыі больш 9 тысяч асоб. Усе выключаны звольнены і з пасадаў. Між выключанымі з компартыі і прагнаных са службы ёсьць шмат ідэйных камуністаў, але ўкраінскіх. Гэтай „чысткай" маскоўскія камуністы выганяюць усіх тых сяброў, каторыя далі сябе пазнаць, як украінцы, або беларусы. З гэтага відаць, што маскоўскі інтэрнацыяналізм вельмі глыбока пранікнуты расейскім нацыяналізмам і ў страху, каб не развалілася, збудаваная маскоўскімі царамі, расейская турма народаў, так жорстка распраўляюцца з украінцамі і беларусамі, каб утрымаць „единую неделимую матушку Россию".

Да нас пішуць.

ВОЙТ НЕ ВЫКОНВАЕ ЗАКОНУ І ЧАКАЕ, ШТО ЯМУ СКАЖУЦЬ З ГАРЫ.

Цяцеркі, Браслаўскі пав. Ад даўна мы стараліся роднай школы ў нашай вёсцы, аднак і сяньня яе ня маем. Былі злажыўшы дэклярацыі ў 1925 г., але і гэта не памагло. Цяпер, калі Беларускі Інстытут Гасп. і Культуры ідзе з помаччу ў дамаганьні ўрадавай беларускай школы, то мы ўсе, хто мае дзяцей у школьным веку пайшлі з дэклярацыямі ў м. Еды да войта, каб пацьвердзіў нашыя падпісы на дэклярацыях але войт, пан Рудоміно — польскі вайсковы асаднік, адмовіў пацьвердзіць, тлумачачы тым, што ня мае спэцыяльнага паведамленьня ў гэтай справе ад Браслаўскага школьнага інспэктара. Гэтак адмовіўшыся пасьведчыць падпісы запэўніў нас, што паведаміць калі прысьці з дэклярацыямі.

Дык, мы чакалі з дня на дзень, з нядзелі на нядзелю, а пан войт, як маўчыць, так і маўчыць. Відаць сьцягвае тэрмін складаньня дэклярацыяў, каб гэтакім чынам і на наступны год ня было школы ў нашай вёсцы.

Відзячы такую работу нашага войта, мы думаем гэтую справу парушаць у іншых, вышэйшых школьных установах.

Цяцерскі.

АД РЭДАКЦЫІ. Зьвярніцеся ў гэтай справе да Школьнага Інспэктара, а калі гэта не паможа, дык скіруйце заяву, або вышліце дэлегата да Куратарыюм Віленскага Школьнага Вокругу. У гэтай справе не адмовіць вам помачы Цэнтр. Камітэт Бел. Інстытуту Г. і Культ.

ПЕРШЫ ЭТАП ЦЯЖАРУ Ў ЗДАБЫЦЬЦІ РОДНАЙ ШКОЛЫ І КРЫХУ АБ АСАДНІЦКАЙ МАЛАЧАРНІ.

Новаельня, Навагрудзкага пав. Беларусам здабыць родную школу ня так лёгка, як здаецца. Перашкод на гэтай дарозе да беларускай школы так многа, што і пералічыць трудна. Апрача тае процэдуры, якой вымагае закон, спатыкаюцца труднасьці і ў тлумачэньні гэтага закону. Закон вымагае падаць дэклярацыі школьнаму інспэктару з пасьведчаным подпісам. Подпісы можа сьведчыць і гмінны войт. Здавалася, што калі гэта выканаць, дык усё будзе ў парадку. Але-ж, як гэта выканаць, калі войт гэты закон тлумачыць па свойму і ня хоча пасьвядчаць падпісоў на дэклярацыях?

Закон, дазваляючы войту сьведчыць на школьных дэклярацыях подпісы, не абавязвае яго ўглядацца ў зьмест школьнай дэклярацыі, ці там пісаны год, месяц і дзень раджэньня дзіцяці ці не, тымчасам войт вытлумачыў сабе гэты школьны закон па свойму і адмовіўся сьведчыць подпісы на школьных дэклярацыях, толькі дзеля таго, што ў дэклярацыях няма даты раджэньня дзіцяці. Гэтае тлумачэньне школьнага закону праз нашага войта і яго вымаганьні у гэтай справе цягнуць за сабой вялікія кошты, бо кожная мэтрыка каштуе аж некалькі злотых, а нашы сяляне пры сучаснай матэрыяльнай беднасьці гэтага выканаць ніяк не могуць. Такім чынам войт сваей уладай стварыў такую немагчымасьць, што далей ані руш.

Ёсьць так-жа і іншыя перашкоды. Рожныя працаўнікі беларускай школы даносяць туды, куды трэба, што той хто паясьняе патрэбу беларускай школы і закон, як яе здабыць — агітуе проціў школы польскай — і справа каб адказываць прад судом гатовая. Гэтакай ахвярай, фалшывага даносу, стаўся ў нас дзейны беларус, М. Мароз. Як вырашыць гэтую справу Суд, пакажа будучыня. Дык вот якія труднасьці беларусам на дарозе да роднай школы. Трэба каб гэтым зацікавіліс беларускія паслы.

А цяпер крыху аб асадніцкай малачарні.

У нас польскія асаднікі, якія, праўду кажучы, ня ўмела гаспадараць і на сваіх недзелах, узяліся за гаспадарку і арганізацыйную. Залажылі яны малачарню. Але, як недаюць даходу без дапамогі асадніцкія гаспадаркі, таксама дае толькі дэфіцыт і зарганізаваная праз іх малачарня. Пад рад абодва гады — 1928-29 асадніцкай малачарні былі такія нешчасьлівыя, што абодва прынеслі толькі дэфіцыт. У выніку гэтага „няшчасьця“, якое прынесьлі гэтыя два гады для асадніцкай малачарні — яна сёлета ў палавіне лета закрылася, а малачары пачалі знаёміцца з судовымі справамі.

Нічога сабе асадніцкая гаспадарка, толькі вучыцца нам ад іх дык ня трэба.

Пупкін.

З ЖЫЦЬЦЯ НЯСЬВІЗКАГА ПАВЕТУ.

Чытаючы „Б. Крыніцу“, рэдка калі даецца сустрэнуць карэспандэнцыю з Нясьвізкага пав. Тымчасам і ў нашым павеце, як і ў іншых кутках Заходняй Беларусі ёсьць балячкі надта-ж дакучлівыя для беларускага насельніцтва. Найбольшая з іх — гэта адсутнасьць роднай школы. Беларускія дзеці растуць нявукамі. Польская школа, ня гледзячы на ўсе стараньні, як чужая, нічога нашым дзецям не дае. Сорамна нам беларусам, што на сваей зямлі ды ня маем роднай школы. Браты беларусы! Ёсьць-жа школьны закон, паводле якога мы маем права дамагацца роднай школы. Дык усе як адзін на школьны фронт і падайма школьнаму інспэктару ў Нясьвіжы дэклярацыі на родную школу. Ніякай бяды за гэта ня можа быць.

Другой балячкай ёсьць — падатковыя цяжасьці. Ніколі яны ня былі такія цяжкія, як цяпер. Збожжа таннае, заработкаў няма, а падаткі плаціць трэба. А падаткаў гэтых, дык так шмат, што і пералічыць трудна: — панствовыя, гмінныя, соймікавыя, шарварковыя, дадаткі да падаткаў, выраўнаўчыя і іншыя. На гэтым яшчэ не канец, бо прыходзіцца нашым сялянам часта плаціць і рожныя штрафы: сабака не навязаны быў — штраф, канём не ўкелзаным ехаў — штраф, комін або хата з надворку не пабелены — штраф ды і шмат за што іншае, ўсё штраф ды штраф.

Зямельны голад таксама даецца ў знакі. Гаспадарачкі сялянскія дробныя, па 3, 2 і 1 дзесяціне. Рэформа рольная не праводзіцца. Аб куплі зямлі і думаць сялянін ня можа, бо дзесяціна каштуе 400—500 руб. золатам. Камасацыя праводзіцца вельмі марудна. Ёсьць вёскі дзе камасацыя цягнецца 6—7 гадоў.

Агулам кажучы, жыцьцё вёскі з кожным годам ўпадае. Сяляне не бачачы выхаду з гэтага цяжкога палажэньня сталіся нейкія незарадныя і апатычна на ўсё глядзяць. Пагоршыўся і стан маральны.

Усё часьцей і часьцей здараюцца рожныя жудасныя, крывавыя падзеі. Мала дзе спатыкаюцца людзі ахвочыя змагацца з злом. Словам вычуваецца нейкая перамучанасьць, якая адабрала ўсялякую ахвоту да парываў вышэйшых ідэалаў. Сяляне нямаюць ніякай надзеі на лепшую будучыню, губляюць веру ў лепшае заўтра. Словам вычуваецца поўная апатыя да ўсяго. Рэч зразумелая, што такі псыхічны стан ёсьць зьявішчам ненармальным і згубным. Належалаб, каб беларускія паслы і сэнатары пастараліся заглядаць у наш павет і будзіць сялян з апатыі. А гэта беларускім паслом удалося-б, бо нашы сяляне, сьведама чуюцца беларусамі. Трэба толькі падходзіць да сялян з чыстым ад усялякіх палітычных спробаў сумленьнем. Праступкам ёсьць падыход да сялян дзеля выкарыстаньня іх у імя варожых сялянству ідэалаў. Тут трэба чыстых рук і чыстага ў любові да сялянства сэрца.

Мужычок.

БЕЛАРУСКАЯ ПРАЦА АЖЫЎЛЯЕЦЦА.

в. Сялец, Беліцкай гміны Лідзкага пав. Наша веска даволі вялікая. Паложана яна, каля самусяньскай станцыі Неман і над ракой Нёман. Жыхары нашай вёскі ўсе беларусы і амаль ня ўсе праваслаўныя. Між праваслаўнымі і каталікамі беларусамі поўны сулад і згода. Беларусы, як праваслаўныя так і каталікі працуюць у адным кірунку над адраджэньнем гаротнага нашага народу. Ёсьць у нас арганізацыя Т-ва Беларускае Школы. Наш гурток Т-ва Б. Ш. даволі добра працуе. У гэтым месяцы зладжаны два беларускія спэктаклі. Дня 4.XI адыграны: „Дзядзька Якуб“ Ф. Аляхновіча і „Модны шляхцюк“ К. Каганца і прадэклямаваны вершы: — Ты мой брат“ А. Гаруна, „Хай сьмяецца“ М. Васілька і „Бог ня роўна дзеліць“ Ф. Багушэвіча. Дня 17.XI адыграна:— „Выбары Старшыні“ І. Былпіы і „Боты“, прадэклямаваны два вершы Я. Коласа. Моладзь наша вельмі ахвотна на гэтых спэктаклях танцавала сваю родную беларускую „лявоніху“ пад гукі сваей-жа духавой аркестры.

Н.

Да працы!

Хто хоча лепшай долі
І лепшага заўтра прыждаць,
Свабоды, братства й волі;
Панам жыцьця свайго стаць, —
Няхай ня жджэ ён доўга,
Ня прыдзе само яно з неба,
Хоць працы будзе многа,
Дэклярацыі ўсім злажыць трэба
На беларускую родную школу.
Ня трэба нам школаў-чужых.
Узяўшысь дастанем дазволу,
Толькі трэба палічыць усіх
Грамадою сабрацца павінны;
Ад працы дзянёк адлажыць
Усім трэ' сходзіцца да гміны,
І ў войта пячаць падлажыць.
Дык да справы браты дабрадзеі
Пакуль не прайшоў яшчэ час
Ня трэба нам траціць надзеі,
Што сонца загасла для нас.

Студзянецкі.

Наша пошта.

Л. Жалейка. „Б. К.“ вам высылаецца акуратна спынена ніколі ня была Чаму не атрымліваеце ня ведаем. Высылаем на такі адрэс: Здзенцёл, Касьцельная вул. Апошнія вершы не падходзяць да друку, першы выкарыстаем, як карэспандэнцыю. Даўней прысланыя Вашы творы не друкаваныя, апрача некаторых, што паадзіночна зьмешчаны былі ў сваім часе ў „Б. К.“ Асобнай кніжыцай выдаць рэдакцыя ня мае сродкаў матэрыяльных. Карэспанд. зьмяшчаем, але скараціўшы дзеля браку месца ў нашай часопісі.

Ігн. Лобачу ў Амэрыцы. „Б. К.“ пасылаем; не забывайце аб падпісной плаце.

Я. Хаданёнку. „Б. К“ высылаем. Просьбу Вашу споўнілі адносна календара. У Вільні выходзяць наступныя беларускія часопісі: „Бел. Крыніца“, „Шлях Моладзі“. „Chryścijanskaja Dumka“ . інш.

Я. Менько. „Бел. Крыніцу высылаем.

Л. Цыдзіку. Будзьце ласкавы больш доплатных пісям не прысылаць' бо ня будзем прымаць такія. На паданыя адрасы газэту пасылаем.

Ант. Кахановічу ў Францыі. „Б. К.“ пасылаем акуратна.

Ст. Захарэвічу. Некаторыя вершы, папраўіўшы зьмесьцім. Пішыце карэспандэнцыі з Вашага кутку.

М. Дурэйцы. З карэспандэнцыі карыстаем.

Туру. З прысланага скарыстаем.

Праваслаўнаму беларусу. З карэспандэнцыі выкарысталі.

М. Васільку. „Б. К.“ пасылаем. Той да каго Вы скіравалі сваё пісьмо ён у салдатах. Марвіч знаходзіцца ў Вільні, ходзіць на Унівэрсытэт Ст. Баторага.

Збянтэжанаму. Гэная заява (пратэст) нічога не паможа, ані Вам, ані пратэстуючаму. Гэтак сказана ў Судзе.

М. Марсзу. Па кніжкі і календары зьвяртайцеся ў кнігарню „Пагоня“.

В. Янушк. Грошы атрымалі — газэту пасылаем.

М. Ступлевічу. Грошы атрымалі, газэту будзем высылаць з 1.XI'.

П. Марцінкевічу у Латвіі. Грошы атрымалі, дзякуем; газэту пасылаем.

М. Чарвякову ў Эстоніі Адказ на вашае пытаньні далі ў № 33 „Б. К.“

З. Лякотко. Просьбу Вашу спаўняем.

Валожынцу. Корэспондэнцыі ня можам зьмясьціць, бо Вы ня падалі свайго імя прозьвішча і дакладнага адрэсу для ведама рэдакцыі. Калі ласка пастарайцеся гэта зрабіць у хуткім часе.

Ів. Лісоўскаму. Просьбу Вашу споўнілі, г. зн. справу календароў перадалі кнігарні „Пагоня“. Газэту будзем пасылаць ад 1 XII с. г.

Ул. Дуброўскаму. Грошы атрымалі дзякуем „Б. К.“ будзем пасылаць з 1. XII. с. г.

Др. І. Гагаліскаму. Грошы атрымалі, дзякуем.

Танная прадажа беларускіх кніг.

БЕЛАРУСКАЯ КНІГАРНЯ «ПАГОНЯ»
(Вільня, Людвісарская № 1)

ладзіць танную прадажу беларускіх кніг, якіх сьпіс кнігарня высылае, хто прышле на гэта марку на 10 гр.

Кнігарня на кожнай з празначаных для таннай прадажы кніг робе значную ўступку, а на некаторых уступае палавіну (50 проц.) Танная прадажа ўжо пачалася і будзе трываць да 1. XII. 1929 г. Грамадзяне, пасьпяшыце скарыстаць з гэтай рэдкай аказіі.

Увага: Кніжкі высылаюцца поштай па атрыманьні ўсей вартасьці заказу, або накладной платай (za pobraniem) па атрыманьні аднэй трэцяй часткі вартасьці заказу.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны Вільня, Завальная 6—10. Выдавец Альбін Стэповіч.